3. Полина, Н.И. Телосложение школьников Беларуси в городах разного уровня урбанизации на рубеже XX и XXI вв. / Н.И. Полина, И.И. Саливон // Актуальные вопросы антропологии: сб. науч. тр. / Институт истории Нац. акад. наук Беларуси. – Минск, 2010. – Вып. 5. – С. 195 – 207.

4. Полина, Н.И. Психофизиологическое изучение школьников г. Полоцка / Н.И. Полина // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. прац міжнар. навук.-практ. канф., Полоцк, 21–23 красав. 2011 г.: у 2 ч. Ч. 1. / Полацкі дзярж. ун-т; пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк, 2011. – С. 25 – 31.

5. Саливон, И.И. Детский организм и среда (формирование физического типа в различных геохимических регионах БССР) / И.И. Саливон, Н.И. Полина, О.В. Марфина. – Минск: Наука и техника, 1989. – 270 с.

6. Саливон, И.И. Влияние геохимической ситуации на физическое развитие школьников / И.И. Саливон, Н.И. Полина // Экология и здоровье детей: тез. докл. пленума Белорус. мед. о-ва детских врачей. – Минск, 1991. – С. 23-24.

7. Саливон, И.И. Изменение во времени характера распределения типов телосложения и их структурных особенностей у мальчиков / И.И. Саливон // Экологические проблемы природно-технических комплексов. – Полоцк, 2004. – Т. 2. – С. 141–144.

8. Саливон, И.И. Формирование телосложения в городах разного уровня урбанизации / И.И. Саливон, Н.И. Полина // Научн. альм. каф. антропологии. – М.: Изд-во «Энцикл. рос. деревень», 2004. – Вып. 2. – С. 111 – 128.

9. Саливон, И.И. Конституциональные особенности телосложения школьников в контрастных геохимических провинциях Беларуси / И.И. Саливон // Экологическая антропология. – Минск: Белорус. комитет «Дзеці Чарнобыля», 2005. – С. 335 – 340.

10. Саливон, И.И. Изменения морфологических показателей у школьников г. Полоцка на рубеже XX-XXI столетий / И.И. Саливон // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. прац міжнар. навук.-практ. канф., Полоцк, 21–23 красав. 2011 г.: у 2 ч. Ч. 1. / Полацкі дзярж. ун-т; пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк, 2011. – С. 31–35.

11. Polina, N. Morphofunctional peculiarities of 17-year-old Belarus pupils of different somatotypes / N. Polina // Papers on Anthropology XIV. – 2005. – P. 237–250.

12. Salivon, I. Constitution and Reactivity of the Organism / I. Salivon, N. Polina // Journal of Physiological Anthropology and Applied Human Science. – 2005. – № 24. – P. 497–502.

УДК 616-054(476)

ЭКАЛАГІЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ Ў ВЫВУЧЭННІ СТАРАЖЫТНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ[5]

канд. біял. навук В.А. ЕМЯЛЬЯНЧЫК
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Наваполацк

Прааналізаваны тэарэтычныя аспекты выкарыстання экалагічнага падыходу ў вывучэнні антрапалогіі старажытнага насельніцтва Беларускага Падзвіння. Прадстаўлены папярэднія вынікі даследавання матэрыялаў пахаванняў XI–XIX стст., акрэслены перспектывы далейшага антропаэкалагічнага вывучэння Беларускага Падзвіння ў гістарычнай рэтраспектыве.

Вывучэнне старажытнага насельніцтва ў экалагічным аспекце з'яўляецца адным з прыярытэтных накірункаў сучаснай палеаантрапалогіі. Комплексныя даследаванні астэалагічных матэрыялаў са старажытных пахаванняў дазваляюць здзяйсняць рэканструкцыю агульнага стану здароўя, а таксама якасці жыцця людзей у мінулым. Дынаміка паказчыкаў здароўя насельніцтва розных эпох у сваю чаргу адлюстроўвае характар працэсаў адаптацыі, якія мелі месца на розных этапах гістарычнага развіцця.

На працягу ўсёй гісторыі фактары прыроднага асяроддзя аказвалі ўплыў на асаблівасці культуры, у першую чаргу на спецыялізацыю гаспадаркі. Тэмпы і тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця асобных рэгіёнаў у мінулым таксама былі абумоўлены геаграфічна. Так, запазненне сацыяльна-эканамічнага развіцця насельніцтва лясной зоны Усходняй Еўропы ў параўнанні з леса-стэпавай, чарназёмнай зонай, у эпоху неаліту і бронзы было абумоўлена неспрыяльнымі ўмовамі для развіцця земляробства, а таксама аддаленасцю ад старажытных цэнтраў цывілізацыі і радовішчаў каляровых металаў.

Сувязі чалавека з навакольным асяроддзем разнастайныя і складаныя. Уплывы прыроднага асяроддзя на чалавека можна ўмоўна падзяліць на дзве групы:

1. Непасрэднае ўздзеянне на біялагічныя характарыстыкі. Так, тэмпературны рэжым аказвае ўплыў на фарміраванне даўжыні, масы і прапорцый цела, а таксама на асноўны абмен рэчываў;

[5] Работа выканана пры падтрымцы БРФФД па тэме ГБ 1711 «Полацк і Полацкая зямля IX – XVIII стст.: сацыяльная тапаграфія, гаспадарка і культура: гісторыка-параўнаўчы аналіз».

геахімічны фактар уплывае на мінеральны склад і памеры шкілета [1, с. 110]. У прыватнасці, І.І. Салівон было паказана, што матурызацыя шкілета ў насельніцтва басейна Заходняй Дзвіны ў параўнанні з насельніцтвам паўднёвых рэгіёнаў Беларусі абумоўлена сваеасаблівасцю геахімічнай сітуацыі (максімальная для тэрыторыі Беларусі канцэнтрацыя гліназёму, вокіслаў жалеза, кальцыя, магнія, усіх мікраэлементаў і мінімальная – крэмнязёму) [6, с. 258]. І наадварот, у раёнах з недахопам кальцыя назіраецца паніжэнне даўжыні цела, павелічэнне шыротных памераў шкілета, адноснае ўкарачэнне чэрапа (брахікефалізацыя) [1, с. 110].

2. Ускоснае ўздзеянне праз сацыяльны фактар. Прыродна-кліматычныя ўмовы, асабліва на ранніх этапах гісторыі чалавецтва, аказваюць істотны ўплыў на характар вытворчай дзейнасці. У кожным канкрэтным выпадку фарміруецца свая аптымальная стратэгія адаптацыі (стратэгія жыццезабеспячэння), якая адпавядае існуючаму ўзроўню развіцця вытворчых сіл. Ключавым у сучаснай сацыяльна-культурнай антрапалогіі з'яўляецца ўяўленне, што чалавек з'яўляецца часткай экасістэмы, а яго культура ўяўляе сабой надарганізменную сістэму адаптацыі. Спецыфіка гаспадарчага ўкладу, у сваю чаргу, вызначае склад харчавання, характар фізічных і эмацыянальных нагрузак, санітарна-гігіенічныя ўмовы жыцця людзей. Характар рэльефу і структура гідраграфічнай сеткі ўплываюць на фарміраванне сістэмы рассялення і камунікацый і, адпаведна, утварэнне прасторавых сацыяльных сістэм. Апошняе аказвае непасрэдны ўплыў на генадэмаграфічную структуру папуляцый.

Для даследавання праблем экалогіі чалавека ў свой час была прапанавана тэарэтычная мадэль тэрытарыяльнай антрапаэкасістэмы (далей – ТАЭС) [5]. У адпаведнасці з гэтай мадэллю вывучэнне чалавека і навакольнага асяроддзя праводзіцца ў рамках адзінай сістэмы, у якой усе даследуемые сувязі цэнтруюцца на чалавека. Адметнасцю ТАЭС як геасістэмы з'яўляецца гетэрагеннасць сувязей, паколькі чалавек арганічна ўключаны як у жывую прыроду, так і ў сістэму сацыяльна-эканамічных адносін. Пры гэтым галоўнай характарыстыкай прамых і зваротных сувязей у ТАЭС, якая не дапускае іх паасобнага вывучэння, з'яўляецца іх адаптыўны характар. Менавіта адаптацыя выступае ў якасці фундаментальнай уласцівасці ТАЭС, якая адносіцца да класу адаптыўна-адаптуючых сістэм [5, с. 70].

Вывучэнне канкрэтнай ТАЭС у якасці прасторавай сістэмы магчыма пры ўмове, калі гамагенная ў пэўных адносінах група насельніцтва (папуляцыя) суаднесена з населенай ёю прасторай, унутры якой узаемасувязі і ўзаемаадносіны гэтай групы з навакольным асяроддзем аднастайныя. Пры адпаведнасці гэтай сістэмы парогавым крытэрыям геаграфічнасці яна можа разглядацца як тэрытарыяльная, а значыць як геасістэма. Апошняе раскрывае новыя магчымасці даследавання, паколькі існуюць пэўныя адзіныя заканамернасці працэсаў самаарганізацыі і самарэгулявання ў сістэмах абіятычнага, біялагічнага і сацыяльнага ўзроўняў [2, с. 7].

У якасці рэальнага прасторавага ўвасаблення ТАЭС можна разгледзець канкрэтны гісторыка-культурны рэгіён Беларусі, а менавіта – Беларускае Падзвінне.

Мэта артыкула – абаснаваць правамернасць выкарыстання мадэлі ТЭАС у вывучэнні антрапаэкалогіі старажытнага насельніцтва Беларускага Падзвіння, падвесці папярэднія вынікі даследаванняў, акрэсліць перспектывы далейшага вывучэння працэсаў адаптацыі ў старажытных папуляцыях чалавека на тэрыторыі Беларускага Падзвіння.

У якасці асобнай гісторыка-этнаграфічнай адзінкі Беларускае Падзвінне (Паўночны рэгіён, Беларускае Паазер'е) было вылучана В.С. Цітовым [8, с. 55]. Вылучэнне тэрытарыяльна-этнічных адзінак праводзілася паводле наступнай сістэмы крытэрыяў: адметныя прыродна-геаграфічныя ўмовы, асаблівасці этнічнай гісторыі, гаспадарча-побытавы ўклад і арганізацыя жылога асяроддзя. На думку В.С. Цітова, гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны адлюстроўваюць складаную гісторыю фарміравання этнічнай тэрыторыі і размяшчаюцца ў раёнах з блізкімі гістарычнымі і экалагічнымі ўмовамі, імкнучыся да басейнаў вялікіх рэк.

Беларускае Падзвінне займае басейн сярэдняга цячэння Заходняй Дзвіны і яе прытокаў (паўднёвая мяжа праходзіць па днепра-дзвінскім водападзеле) і вылучаецца сваімі прыродна-геаграфічнымі ўмовамі. Спецыфіка рэльефу і структура гідралагічнай сеткі абумоўлены ўздзеяннем апошняга, вюрмскага абледзянення. Для рэгіёну характэрны мяшаныя лясы і мазаічная структура ландшафтаў.

Што датычыць этнічнай гісторыі, то В.С. Цітоў разглядае фарміраванне этнакультурных асаблівасцей рэгіёна, пачынаючы з VII − IX стст., а менавіта – з часоў утварэння ўсходнеславянскага племяннога аб'яднання полацкіх крывічоў.

Аднак рэтраспектыўны аналіз дынамікі археалагічных культур дазваляе выказаць меркаванне, што Беларускае Падзвінне пачынае выступаць у якасці адносна ўстойлівай этнакультурнай вобласці са значна больш даўніх часоў. Засяленне тэрыторыі Беларускага Падзвіння чалавекам адбываецца ў эпоху мезаліту. У гэты час тэрыторыя Паўночнай Беларусі ўваходзіла ў склад кола культур паўночнага

мезаліту Еўропы, і прадстаўлена культурай Кунда, якая займала абшары Усходняй Прыбалтыкі і паўночную частку Усходне-Еўрапейскай раўніны. Мезалітычнае насельніцтва гэтага рэгіёну з'яўлялася прамымі нашчадкамі пасяленцаў эпохі фінальнага палеаліту, якія рухаліся следам за адступаючым ледавіком [3, с. 18]. Менавіта ў эпоху мезаліту пачынае складвацца сістэма рассялення, якая захоўваецца ў рэгіёне на працягу наступных тысячагоддзяў. Гэтая сістэма рассялення заснавана ў першую чаргу на эфектыўнай эксплуатацыі пойменна-рачных, азёрных і прыморскіх ландшафтаў [3; 19].

У эпоху неаліту (каля 4 – 2 тыс. год да н.э.) на базе культуры Кунда фарміруецца нарвенская культура. Пераход ад мезаліту да ранняга неаліту на паўночным захадзе Усходне-Еўрапейскай раўніны не суправаджаецца зменай насельніцтва, што знаходзіць пацьвярджэнне ў антрапалагічных матэрыялах. Так, насельніцтва нарвенскай культуры было прадстаўлена еўрапеоідным умерана масіўным шырокатварым антрапалагічным тыпам, генетычна звязаным з краманьёіднымі тыпамі эпохі верхняга палеаліту. У познім неаліце ў выніку міграцыі носьбітаў культуры ямкава-грабенчатай керамікі на большай частцы Паўднёва-Уходняй Прыбалтыкі нарвенская культура спыняе сваё існаванне, у той час як на тэрыторыі Беларускага Падзвіння "нарвенская" традыцыя працягвае захоўвацца. У выніку тут складваецца своеасаблівы "крывінскі" варыянт нарвенскай культуры. Што датычыць сістэмы рассялення, то да канца эпохі неаліту на тэрыторыі Беларусі па-ранейшаму былі заселены толькі рачныя даліны больш-менш вялікіх рэк. Арэалы археалагічных культур у асноўным супадаюць з басейнамі рэк.

Пачатак эпохі бронзы суправаджаецца істотнымі этнакультурнымі зменамі на абшарах Усходняй і Паўночнай Еўропы. На мяжы 3 і 2 тысячагоддзяў да н.э. тут распаўсюджваюцца генетычна блізкія паміж сабой культуры са шнуравой керамікай, адбываецца канчатковы пераход да вытвараючых форм гаспадаркі. Паводле даных археалогіі, на тэрыторыі Беларускага Падзвіння значнай міграцыі "шнуравікоў" не прасочваецца. Пад уплывам больш развітых культур Падняпроўя ў межах рэгіёна фарміруецца паўночнабеларуская культура. Нягледзячы на паступовы пераход да вытворчай гаспадаркі, на поўначы Беларусі доўгі час працягваюць адыгрываць важную ролю прысвойваючыя формы гаспадаркі – паляванне і збіральніцтва. Распаўсюджанне "шнуравых" культур таксама не суправаджаецца заўважнымі зменамі ў схеме рассялення: паселішчы па-ранейшаму канцэнтруюцца ў межах рачных поймаў і азёрных катлавін [3, с. 20].

Эпоха жалеза ў Беларускім Падзвінні прадстаўлена днепра-дзвінскай культурай. Новыя археалагічныя даныя ўсё больш пераканаўча сведчаць на карысць мясцовага паходжання гэтай культуры. На працягу 1 тыс. да н.э. і ў 1 тыс. н.э. адбываюцца змены ў гаспадарцы, сацыяльнай арганізацыі, схеме рассялення. Умацаваныя гарадзішчы гэтага часу ўпершыню з'яўляюцца ва ўскраінных частках асноўнай (марэннай) вобласці апошняга абледзянення, астанцовых узвышшах у межах азёрна-ледавіковых раўнін. Гаспадарка заснавана пераважна на жывёлагадоўлі і лядным земляробстве.

У III – V ст. н.э. у арэал днепра-дзвінскай культуры пачынаюць пранікаць носьбіты кіеўскай культуры. У выніку да сярэдзіны V ст. н.э. фарміруецца тушамлінская (тушамлінска-банцараўская) культура. Насельніцтва пражывала на адкрытых селішчах, размешчаных на берагах рэк і азёр. Частка былых умацаваных гарадзішчаў дадаткова ўмацоўваецца і пачынае выкарыстоўвацца ў якасці гарадзішчаў-сховішчаў. Гаспадарка па-ранейшаму заснавана на жывёлагадоўлі і лядным земляробстве. З'яўляюцца грунтовыя могільнікі с трупаспаленнямі, курганныя могільнікі. У Беларускім Падзвінні складваецца лакальны (атокінскі) варыянт банцараўскай культуры, які характарызуецца з'яўленнем побач з круглымі курганамі доўгіх валападобных насыпаў. У эпоху ранняга сярэднявечча на гэтых абшарах складваецца племянная супольнасць полацкіх крывічоў, на аснове якой у X ст. фарміруецца Полацкае княства.

Такім чынам, Беларускае Падзвінне выступае ў якасці адметнага гісторыка-культурнага рэгіёна, пачынаючы з эпохі позняга неаліту. Калі звярнуцца да вопыту гісторыка-культурнага раянавання Прыбалтыкі, можна пераканацца, што падобная сітуацыя не з'яўляецца выключэннем. У свой час Прыбалтыка была вылучана ў якасці аднаго з характэрных прыкладаў пры абаснаванні паняцця гісторыка-культурнай альбо гісторыка-этнаграфічнай вобласці [9]. У выніку Прыбалтыйскай комплекснай экспедыцыі былі выяўлены межы Прыбалтыйскай гісторыка-культурнай вобласці, яе падраздзяленняў і раёнаў, а таксама прааналізаваны асноўныя прычыны, якія абумовілі іх утварэнне. Было ўстаноўлена, што на ўзнікненне мясцовых асаблівасцей у гаспадарцы, культуры і ладзе жыцця чалавека ўплываюць не толькі значныя і рэзкія адрозненні ў геасістэмах (напрыклад, на ўзроўні прыродных зон – лес, стэп, горы), але таксама лакальныя асаблівасці ў межах гэтых вялікіх геаграфічных абласцей. Прычым абумоўленыя імі адрозненні ў матэрыяльнай культуры і побыце насельніцтва прасочваюцца ўжо з часоў позняга неаліту. Было паказана, што гісторыка-этнаграфічныя падраздзяленні Усходняй Прыбалтыкі, якія дажылі да нашых дзён, пачалі складвацца ў глыбокай старажытнасці, калі не было яшчэ ніводнага сучаснага народа – ні славян, ні балтаў, ні прыбалтыйскіх фінаў [9, с. 73].

Асноўныя заканамернасці структуравання этнакультурнай прасторы ў межах Усходне-Еўрапейскай раўніны можна сфармуляваць наступным чынам:

1. Для Усходне-Еўрапейскай раўніны характэрна яскрава выражаная прыродная занальнасць. Адрозненні ў культурным і гаспадарчым развіцці паміж лясной, леса-стэпавай і стэпавай зонамі відавочныя. Што датычыць лясной зоны, то спецыфіка развіцця тут выяўляецца ў адноснай кансерватыўнасці ўкладу эканомікі, меншай міграцыйнай актыўнасці насельніцтва ў параўнанні са стэпавай зонай, і адпаведна – большай ступені яго генетычнай пераемнасці, значнай ролі старажытных субстратаў у фарміраванні антрапалагічных асаблівасцей сярэднявечнага і ў некаторай ступені сучаснага насельніцтва.

2. У межах лясной зоны Усходняй Еўропы вылучаюцца два вялікія рэгіёны, у адпаведнасці са шляхамі першапачатковага засялення тэрыторыі і фарміраваннем асноўных расавых тыпаў: дняпроўска-прыбалтыйская зона (балтыйская антрапалагічная зона паводле В.В. Бунака); басейн Волгі (усходне-еўрапейская антрапалагічная зона).

3. Утварэнне больш дробных структурных адзінак у межах дняпроўска-прыбалтыйскай зоны непасрэдна звязана са структурай гідраграфічнай сеткі. Так на тэрыторыі Беларусі фарміруюцца лакальныя гісторыка-этнаграфічныя вобласці: Палессе, Падняпроў'е, Панямонне, Падзвінне. Прычым рэкі ў гэтым выпадку адыгрываюць дваістую ролю: з аднаго боку – абумоўліваюць адносную ўстойлівасць схемы рассялення і камунікацый, з другога боку – выступаюць у якасці шляхоў міграцый і разнастайных культурных уплываў.

Захаванне ў курганных пахаваннях полацкіх крывічоў XI – XIII стст. умерана-масіўнага шырокатварага антрапалгічнага тыпу, генетычна звязанага са старажытнейшым насельніцтвам рэгіёна, сведчыць пра генетычную пераемнасць асноўнай масы насельніцтва, што пражывала на гэтых абшарах, пачынаючы з моманту засялення тэрыторыі чалавекам.

Такім чынам, на прыкладзе Беларускага Падзвіння мы маем выпадак, калі адносна аднародная група насельніцтва суаднесена з населенай ёю прасторай, устойлівасць этнакультурных межаў якой захоўваецца на працягу археалагічных эпох. Такім чынам, Беларускае Падзвінне можна разглядаць як эвалюцыянуючую тэрытарыяльную антрапаэкасістэму.

Даследаванні ў галіне гістарычнай антрапаэкалогіі дазваляюць выяўляць адаптыўныя сіндромы, якія складваюцца ў выніку рэзкіх стрэсавых працэсаў, напрыклад, пры пераходзе да новага тыпу гаспадарання, пры міграцыях і г.д. Вывучэнне працэсаў адаптацыі ў межах Беларускага Падзвіння ў гістарычнай рэтраспектыве пакуль абмежавана адсутнасцю астэалагічных матэрыялаў, якія б датаваліся часам раней канца X ст. н.э. Такім чынам, храналагічныя рамкі даследавання па аб'ектыўных прычынах абмежаваны эпохай Сярэднявечча і Новага часу. У прыватнасці, намі былі даследаваны краніялагічныя матэрыялы, прадстаўленыя некалькімі храналагічнымі групамі насельніцтва: 1) вясковае насельніцтва Полацкай зямлі XI–XIII стст.; 2) вясковае насельніцтва Полацкай зямлі XIV–XVI стст.; 3) насельніцтва Полацка XVII–XVIII стст.; 4) вясковае насельніцтва XVIII–XIX вв. (Лукомль). Штогод астэалагічная калекцыя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта папаўняецца за кошт паступлення новых матэрыялаў з раскопак беларускіх археолагаў.

Краніялагічныя даследаванні дазваляюць скласці ўяўленне аб зменлівасці альбо пераемнасці насельніцтва пэўных рэгіёнаў, ацаніць рэальны маштаб старажытных міграцый. Так, вывучэнне краніялогіі насельніцтва Полацкай зямлі эпохі сярэднявечча і Новага часу дазволіла ўстанавіць, што ў XI–XIV стст. ў рэгіёне актывізуюцца міграцыйныя працэсы. Так, прысутнасць у матэрыялах грунтовага могільніка Казлоўцы лапаноіднага тыпу са сплошчаным і нізкім тварам сведчыць аб пранікненні на тэрыторыю Полацкай зямлі ў XI–XII стст. асобных груп прыбалтыйска-фінскага насельніцтва з поўначы. У XIII–XIV стст. на тэрыторыю Полацкай зямлі пранікаюць асобныя групы насельніцтва з захаду, аб чым сведчыць антрапалагічнае падабенства мезакраннага, адносна грацыльнага насельніцтва з ранніх жальнічных пахаванняў з насельніцтвам, прадстаўленым каменнымі магіламі з тэрыторыі Беларускага Панёмання. Міграцыя груп мужчынскага насельніцтва з захаду магла быць абумоўлена сацыяльна-гістарычнымі працэсамі, звязанымі з уключэннем Полацкага княства ў склад Вялікага Княства Літоўскага [4].

Параўнальны аналіз краніяметрычных даных па сельскім насельніцтве паўночнай Беларусі XI – XIX стст. паказаў, што разам з эпахальнымі працэсамі брахікефалізацыі і грацылізацыі ў рэгіёне ў накірунку да сучаснасці адбываецца невялікае паслабленне еўрапеоідных рыс, якое выявілася ў паніжэнні выступання пераносся, а ў жанчын – яшчэ і ў павелічэнні выступання сярэдняй часткі твару (зрух у бок мезагнатнасці) [7].

Адным з найважнейшых накірункаў гістарычнай антропаэкалогіі з'яўляецца палеадэмаграфія. Смяротнасць з'яўляецца важнейшым паказчыкам стану здароўя насельніцтва і вызначаецца такімі фактарамі, як узровень дабрабыту насельніцтва, харчаванне, санітарна-гігіенічнае становішча, даступнасць і якасць медыцынскай дапамогі. У гістарычнай антрапаэкалогіі смяротнасць разглядаецца як абагульняючы крытэрый адаптацыі насельніцтва да пэўных сацыяльных і прыродных умоў асяроддзя. Дэмаграфічны аналіз у 4-х храналагічных выбарках гарадскога і вясковага насельніцтва Полацкай зямлі дазволіў зрабіць шэраг папярэдніх высноў. Эпахальная дынаміка агульнай чаканай працягласці жыцця і сярэдняга ўзросту смерці дарослых у групах вясковага насельніцтва на працягу значнага храналагічнага перыяду практычна адсутнічае (табл. 1). Гэта сведчыць аб адноснай стабільнасці ўмоў жыцця ў вясковых пасяленнях у перыяд з XI па XIX ст. н.э.

Табліца 1

Паказчыкі смяротнасці дарослых (без уліку дзіцячай смяротнасці)

Група	Мужчыны			Жанчыны			Разам		
	E_{20}	СЎС	d_{50+}	E_{20}	СЎС	d_{50+}	E_{20}	СЎС	d_{50+}
Вясковае насельніцтва XI–XIII стст.	22,8	41,8	39,0	20,3	39,8	20,6	21,9	41,2	25,5
Вясковае насельніцтва XIV–XVI стст.	17,8	37,3	18,8	21,7	40,7	40,0	21,6	39,4	26,1
Полацк, XVII–XVIII стст.	20,0	39,5	21,4	16,0	35,7	12,5	19,1	36,6	13,3
Вясковае насельніцтва XVIII–XIX стст.	26,6	44,4	49,1	18,9	37,5	32,8	22,7	40,9	35,6

E_{20} – сярэдняя чаканая працягласць жыцця дарослых (год); СЎС – сярэдні ўзрост смерці (год);
d_{50+} – працэнт дажываючых да фінальнай узроставай кагорты (%).

Тэндэнцыя да зніжэння агульнай чаканай працягласці жыцця і сярэдняга ўзросту смерці характэрна для групы гарадскога насельніцтва Полацка XVII–XVIII стст., дзе да таго ж быў зарэгістраваны і мінімальны працэнт дажываючых да фінальнай ўзроставай кагорты.

Ва ўсіх даследаваных групах, за выключэннем групы вясковага насельніцтва XIV–XVI стст., жанчыны маюць меншую чаканую працягласць жыцця ў параўнанні з мужчынамі. У групе вясковых мужчын XIV–XVI стст. былі зарэгістраваны самыя высокія паказчыкі смяротнасці (найменшая чаканая працягласць жыцця, найменшы сярэдні ўзрост смерці, найменшая колькаць дажываючых да фінальнай узроставай кагорты) (гл. табл. 1).

Адным са шкілетных індыкатараў стрэсу, звязаных з непаўнацэнным харчаваннем і павышанай патагеннай нагрузкі, з'яўляецца *cribra orbitalia* – гіперастозныя змены косці ў верхняй вобласці арбіт. Як і дэмаграфічныя паказчыкі, *cribra orbitalio* з'яўляецца своеасаблівым абагульняючым паказчыкам стану здароўя і адаптыўнага статуса старажытнага насельніцтва. Аналіз сустракальнасці *cribra orbitalia* ў розных папуляцыях дазваляе здзяйсняць параўнальную ацэнку агульнага стану здароўя насельніцтва як у крос-культурным, так і ў храналагічным аспектах, без уліку канкрэтнай палеаэпідэміялагічнай сітуацыі.

Максімальныя частоты сустракальнасці *cribra orbitalia* былі зарэгістраваны ў групе вясковага насельніцтва XIV–XVI стст., як сярод дарослых, так і сярод дзяцей (табл. 2). Павышэнне частот сустракальнасці *cribra orbitalia* ва ўказанай групе ў спалучэнні з павышаным узроўнем смяротнасці ўказвае на напружанасць працэсаў адаптацыі, абамоўленую комплексам сацыяльна-гістарычных фактараў.

Табліца 2

Частоты сустракальнасці *cribra orbitalia* сярод дарослых дзяцей

Група	*Cribra orbitalia*			
	Дарослыя		Дзеці	
	N	%	N	%
Вясковае насельніцтва XI–XIII стст.	95	14,7	18	50,0
Вясковае насельніцтва XIV–XVI стст.	41	21,9	4	75,0
Полацк, XVII–XVIII стст.	45	13,3	13	38,5
Вясковае насельніцтва XVIII–XIX стст.	119	16,0	16	56,2

Перспектывы далейшых антрапаэкалагічных даследаванняў старажытнага насельніцтва Беларускага Падзвіння звязаны з назапашваннем і ўвядзеннем у аналіз новых матэрыялаў, а таксама пашырэннем праграмы даследавання, у якую будуць уключаны прыкметы, якія рэгіструюцца на посткраніяльным шкілеце (лініі Харыса, зменлівасць даўжыні цела і масіўнасці ў розных полаўзроставых групах, ступень выражанасці палавога дымарфізму), а таксама індыкатары стрэсу, звязаныя са спецыфічнымі захворваннямі: траўмы, дэгенератыўныя паталогіі, сведчанні інфекцыйных захворванняў і непаўнацэннага харчавання.

ЛІТАРАТУРА

1. Алексеева, Т.И. Адаптивные процессы в популяциях человека / Т.И. Алексеева. – М. : Изд-во МГУ, 1986. – 215 с.
2. Арманд, А.Д. Самоорганизация и саморегулирование географических систем / А.Д. Арманд. – М. : Наука, 1988. – 264 с.
3. Долуханов, М.П. История освоения ландшафтов Северо-Запада Русской равнины в голоцене / М.П. Долуханов // Антропогенная эволюция геосистем и их компонентов : сб. ст. / Н.А. Хотинский, С.А. Сычева (отв. ред-ры). – М. : Ин-т географии АН СССР, 1987. – 162 с.
4. Емельянчик, О.А. Антропологический состав средневекового сельского населения Полоцкой земли по данным краниологии / О.А. Емельянчик // Вестник антропологии. Научный альманах. Вып. 22. / Ин-т этнологии и антропологии им. Н.Н. Миклухо-Маклая РАН. – М. : Оргсервис., 2013. – С. 161–173.
5. Райх, Е.Л. Использование модели ТАЭС в исследованиях экологии человека / Е.Л. Райх // Проблемы экологии человека / отв. ред. В.П. Казначеев. – М., 1986. – С. 70–82.
6. Салівон, І.І. Фізічны тып беларусаў: узроставая, тыпалагічная і экалагічная зменлівасць / І.І. Салівон. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 239 с.
7. Саливон, И.И. Структурные изменения черепа за последнее тысячелетие (XI–XIX вв.) у сельского населения северной Беларуси / И.И. Саливон, О.А. Емельянчик // Весці БДПУ. Сер. 3. Фізіка. Матэматыка. Інфарматыка. Біялогія. Геаграфія. – 2012. – № 1 (71). – С. 33–38.
8. Титов, В.С. Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов / В.С. Титов. – Минск : Наука и техника 1983. – 152 с.
9. Чебоксаров, Н.Н. О древних хозяйственно-культурных связях народов Прибалтики / Н.Н. Чебоксаров // Советская этнография. – 1960. – №3. – С. 94–115.

УДК 572

СРАВНИТЕЛЬНЫЙ АНАЛИЗ МОРФОЛОГИЧЕСКИХ ПАРАМЕТРОВ СТУДЕНЧЕСКОЙ МОЛОДЕЖИ ГОРОДОВ МИНСКА И ПОЛОЦКА

канд. ист. наук, доц. О.В. МАРФИНА
Отдел антропологии и экологии Института истории НАН Беларуси, Минск

Результаты анализа антропологических данных студенческой молодежи городов Минска и Полоцка показали, что большинство обследованных студентов обоих городов имеют нормальное физическое развитие. Однако отмечается явление перераспределения соотношения жирового и мышечного компонентов, которое выражается в превалировании случаев избыточной массы тела за счет повышенного жироотложения преимущественно у юношей (в бóльшей степени в Полоцке), возможно в связи с несбалансированностью питания и гиподинамией.

Соматическое развитие организма может рассматриваться как один из основных показателей уровня здоровья молодежи, дееспособности населения, а также качества окружающей среды и происходящих социально-экономических изменений [4, 6, 8]. Начало XXI в. отмечено ухудшением состояния окружающей среды, что сказывается на здоровье и морфофункциональном состоянии человека. Изучение влияния социально-экономических факторов на процессы роста и развития детей, подростков и молодежи в последние десятилетия также приобретает у исследователей все больший интерес [1, 2, 3, 7].

Проведен сбор комплексных антропологических данных среди студенческой молодежи в Академии управления при Президенте Республики Беларусь и в Учреждении образования «Полоцкий государственный университет». Исследования проводились по программе, включающей соматические показатели [5]. Всего обследовано 173 человека (94 юношей и 79 девушек). Для анализа были использованы полученные морфологические данные по соматическим размерам (длина и масса тела, обхват грудной клетки) (табл. 1), функциональным показателям сердечно-сосудистой системы (систолическое и диасто-